Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-01-05

# “Полымю” — шукаць і шугаць!

**Апошнія дні мінулага года ў літаратурным жыцці краіны азначыліся прыгожым і велічным юбілеем: у канцы снежня споўнілася 90 гадоў з дня выхаду першага нумара найстарэйшага айчыннага літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага часопіса “Полымя”. Цікава, што з усіх “тоўстых” літаратурных часопісаў, заснаваных у Савецкім Саюзе ў 20-х гадах ХХ стагоддзя, да сённяшняга часу шчасліва дажылі толькі два — наша “Полымя” і расійскія “Сібірскія агні”.**

З нагоды юбілею ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыўся літаратурна-музычны святочны вечар і была арганізавана кніжна-ілюстрацыйная выстава “Полымя” — этапы творчага станаўлення”.

Павіншаваць сённяшніх і колішніх палымянцаў са слаўнай гадавінай прыйшоў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Алясандр Радзькоў, які найперш зачытаў віншаванне прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі. У ім, у прыватнасці, былі наступныя словы: “Гэтае найстарэйшае літаратурна-мастацкае выданне Беларусі прайшло адметны гістарычны шлях і адлюстравала значны перыяд жыцця нашага народа. На старонках часопіса друкаваліся творы класікаў, пісьменнікаў даваеннага і пасляваеннага пакаленняў, якія прынеслі беларускай літаратуры прызнанне ў свеце. Ужо ў новым ХХІ стагоддзі “Полымя” знаёміць чытачоў з лепшымі ўзорамі сучаснай айчыннай паэзіі, прозы, публіцыстыкі, крытыкі і літаратуразнаўства. Дзейнасць вашага калектыву спрыяе прафесійнаму росту маладых талентаў, аб’яднанню творчай інтэлігенцыі краіны і развіццю мастацкага слова ў рэчышчы традыцый, закладзеных выдатнымі майстрамі мінулага, дапамагае захаваць багацце духоўнай культуры нашага народа, выявіць глыбіню і адметнасць нацыянальнага характару”. Ад сябе асабіста Аляксандр Міхайлавіч пажадаў часопісу не спыняцца ў сваім развіцці і заўсёды знаходзіцца ў пошуку, тым больш што цяперашняя адкрытасць незалежнай Беларусі да ўсяго свету дае выдатныя магчымасці даследаваць гэты свет сродкамі мастацкага слова, актыўна займацца перакладамі і прадстаўляць на старонках часопіса творы літаратуры іншых народаў. “Трэба шукаць! Трэба шукаць!” — двойчы акцэнтавана падкрэсліў Аляксандр Радзькоў, маючы на ўвазе ў тым ліку і пошукі часопісам свайго месца ў медыяпрасторы, усё большую ролю ў якой сёння пачынаюць адыгрываць інтэрнэт-выданні.




У сваю чаргу намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Матусевіч пажадаў часопісу таленавітых аўтараў, сапраўды грамадска значных высокамастацкіх твораў і ўдзячных чытачоў. Ён таксама згадаў, што ў савецкія часы надрукавацца ў “Полымі” было мэтай і справай гонару кожнага беларускага літаратара, і выказаў спадзяванне, што часопіс і ў далейшым будзе культываваць лепшыя традыцыі тых гадоў, вокамгненна адгукацца на запатрабаванні грамадства і выконваць высокую дзяржаўную місію па развіцці і прапагандзе айчыннай літаратуры. Уладзімір Матусевіч уручыў падзякі міністра інфармацыі Алега Пралляскоўскага калектыву часопіса “Полымя” і рэдактару аддзела прозы Уладзіміру Саламаху.

З цёплымі віншавальнымі словамі да юбіляраў-палымянцаў звярнуліся таксама дырэктар — галоўны рэдактар выдавецкага дома “Звязда” Алесь Карлюкевіч, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Каваленя, акадэмік НАН Беларусі Уладзімір Гніламёдаў, першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Генадзь Пашкоў і іншыя выступоўцы. У сувязі з юбілеем медалі Саюза пісьменнікаў Беларусі “За вялікі ўклад у літаратуру” атрымалі галоўны рэдактар “Полымя” Мікола Мятліцкі, а таксама вядомыя айчынныя літаратары Казімір Камейша, Мікола Маляўка, Мікола Чарняўскі і Васіль Макарэвіч. Аўтары сёлетніх самых адметных “палымянскіх” публікацый, пераважна прадстаўнікі маладога пакалення, атрымалі дыпломы.

І сапраўды, гартаючы сённяшнія нумары часопіса “Полымя”, нельга не заўважыць вялікую колькасць маладых і нават юных творцаў на старонках слыннага выдання. Гэта не можа не радаваць. Бо гэта так ці інакш азначае, па-першае, абнаўленне (імён, тэм, стыляў), а па-другое, пошук, пра які казаў падчас імпрэзы Аляксандр Радзькоў. А пошук — ён жа заўсёды і пошуг гарачага “палымянскага” слова. “Полымю” — шукаць і шугаць!

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*